

УРОКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ... ДАРОСЛЫХ 5

РОДНАЯ ХАТА ПРОДАЖУ НЕ ПАДЛЯГАЕ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

7 КРАСАВІКА 2023 г. ПЯТНІЦА № 66 (29946)

## КОРАТКА

• Мінфін Беларусі размясціў дзяржаблігацыі на суму пяць мільярдаў расійскіх рублёў.

• Сельгасарганізацыі Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта пасеялі больш за 25 працэнтаў ранніх яравых культур.

• ААТ «БЕЛАЗ-СЭРВІС» летась павялічыла аб'ём вытворчасці амаль у два разы.

• НТЦ «ЛЭМТ» у мінулым годзе павялічыў экспарт прадукцыі на 42 працэнты.

• Магістрант БДПУ перамог на конкурсе музычна-мастацкай творчасці China Award.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр БАХАНОВІЧ, першы намеснік міністра адукацыі:**

*«Сёння шмат робіцца ў галіне прафарыентацыйнай работы: гэта і кірмашы мэтавай падрыхтоўкі, экскурсіі на прамысловыя прадпрыемствы і арганізацыі. Яны дапамагаюць рабятам вызначыцца з будучай прафесіяй, сваёй прафесійнай траекторыяй. Магчыма, нам трэба ўзмацніць прафарыентацыйную работу і праводзіць яе не з выпускнікамі — можа быць гэта крыху позна. Трэба больш шырока прыцягваць менавіта заказчыкаў кадраў, прадпрыемствы, каб яны непасрэдна ўдзельнічалі ў дадзеным працэсе. Пра тое ў сваім Пасланні гаварыў кіраўнік дзяржавы: заказчыкі кадраў павінны павярнуцца да ўстаноў адукацыі і важна ўдзельнічаць у навучальным працэсе і ранняй прафарыентацыі, пачынаючы, магчыма, з пятых класаў».*

З першых вуснаў

# «УСЁ МЫ ПЕРААДОЛЕЕМ, ТРЭБА КРЫХУ ЧАСУ»

### Гэтыя словы Аляксандра Лукашэнкі можна назваць лейтматывам яго рабочай паездкі ў Маскву

**Прэзідэнт Беларусі ўчора прыняў удзел у пасяджэнні Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы. А напярэдадні прайшла двухбаковая сустрэча лідараў Беларусі і Расіі, якая, пачаўшыся ўвечары, доўжылася да дзвюх гадзін ночы. Многія пытанні падчас яе абмяркоўваліся ў закрытым фармаце, бо датычыліся стратэгічна важных рэчаў — бяспекі і абароны (ужо назаўтра, на Вышэйшым дзяржсавеце, беларускі лідар адзначыў: «Гэта былі рэзультатыўныя перагаворы. Па ўсіх пытаннях — а іх больш як дзясятак — мы дасягнулі згоды»). Ды і з таго, што было сказана на пачатку ў публічным фармаце, было зразумела: усе настроены на пазітыўны канструктыўны лад.**



Фота БелТА.

«Мы ўсё гэта пераадолеем. І той, хто спадзяецца або прагназаваў, што мы рухнем, — нічога мы не рухнулі. Так, будзе няпроста. А калі было проста? Мы вытрымаем і зробім усё нават у мікраэлектроніцы, дзе мы з вамі год таму, сустракаючыся ў вашым кабінеце, якраз абмяркоўвалі, што нам рабіць. Аказваецца, і тут знайшлі магчымасць працаваць. І ракеты лятаюць, і баявая тэхніка перамяшчаецца і ў нас, і ў вас. Таму ўсё мы пераадолеем, трэба крыху часу», — падкрэсліў беларускі лідар на пачатку сустрэчы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўжо рэалізавана 80 працэнтаў з 28 прынятых саюзных праграм. І частыя сустрэчы з Уладзімірам Пуціным якраз былі звязаны з тым, каб не было тармажэння пры выкананні. Прэзідэнт Беларусі, рыхтуючыся да гэтага Вышэйшага дзяржсавета, заўважыў, што «гэта ўпершыню такое мерапрыемства, дзе мы больш будзем гаварыць, падводзячы вынікі. Ужо менш будзе праблемных пытанняў». «Яны, вядома, ёсць. З'яўляюцца ўсё больш і больш, паколькі мы развіваемся. Ды і падкідваюць нам гэтыя пытанні», — дадаў ён.

#### Шырокапалосныя магістралі для актывізацыі

Ужо на пасяджэнні ВДС, паводле слоў беларускага лідара, «у большай ступені прысвечаным пытанням сацыяльна-эканамічнага характару», Аляксандр Лукашэнка заявіў: «З улікам бягучага моманту значэнне гэтага ўнікальнага міждзяржаўнага аб'яднання (Саюзнай дзяржавы. — **«Зв.»**) цяжка пераацаніць. Па сукупнасці дасягнутых вынікаў за такі непрацяглы перыяд наш саюз па праве знаходзіцца ў лідарах сярод іншых інтэграцыйных аб'яднанняў».

СТАР. 2

Класныя навіны

# Гісторыя ці геаграфія?

### Канчаткова вызначыцца з прадметамі на ЦЭ трэба да 20 красавіка



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Зусім няшмат часу засталося да выпускных экзаменаў. Сёлета яны пройдуць у новым фармаце. Так, у маі адзінаццацікласнікам трэба будзе здаць два цэнтралізаваныя экзамены (ЦЭ), вынікі якіх будуць улічвацца пры выстаўленні выніковай адзнакі ў атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі і залічвацца пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі. Адзін з іх — па рускай або беларускай мове на выбар навучэнцаў — абавязковы для ўсіх. Другі прадмет выпускнік 11 класа выбірае з пераліку прадметаў, які здаецца на цэнтралізаваным тэсціраванні, каб у далейшым з яго вынікам можна было паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову.**

СТАР. 3

Разумныя грошы

# КРЭДЫТЫ ЗНОЎ ТАННЕЮЦЬ

### Некаторыя беларускія банкі ў апошні час апусцілі сярэднія працэнтныя стаўкі




**З якой бы прычыны вы ні вырашылі скарыстацца крэдытам, трэба дакладна ўсведамляць: яго неабходна вярнуць строга ў адпаведнасці з умовамі дагавора, а таксама выплаціць банку працэнты за карыстанне грашыма. Таму варта рэальна ацаніць, наколькі стабільныя вашы даходы і ці зможаце вы своечасова і ў поўнай меры ажыццяўляць плацяжы. Падумайце і крытычна ацаніце неабходнасць звароту па крэдыт. Пажадана, каб гэтыя грошы браліся на сапраўды неадкладныя і абгрунтаваныя мэты. Ва ўсіх астатніх выпадках перавагу варта аддаць зберажэнню.**

**Гэта ўсё лірыка, мы ж сёння пагаворым пра тое, чаму крэдыты таннеюць менавіта цяпер.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

23066>

# «УСЁ МЫ ПЕРААДОЛЕЕМ, ТРЭБА КРЫХУ ЧАСУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт адзначыў, што, планамерна пашыраючы прававую базу ўзаемадзеяння, бакі адкрылі шырокапалосныя магістралі для актывізацыі бізнесу, супрацоўніцтва навуковых колаў і творчых калектываў, партнёрства маладзёжных аб'яднанняў. Свабода перамяшчэння грамадзян і капіталу, роўныя магчымасці для адукацыі і працоўнай дзейнасці — усё гэта бясспрэчныя перавагі інтэграцыі ў вачах звычайных беларусаў і расіян.

«Свайго роду маркерам паспяховасці нашага эканамічнага супрацоўніцтва з'яўляецца колькасць гандлёвых аперацый. За мінулыя 27 гадоў коштавыя аб'ёмы таваразвароту павялічыліся больш як у чатыры з паловай раза. Ключавы напрамак у двухбаковых адносінах — вытворчая кааперацыя. Сёння гэта сувязі больш як 8 тысяч беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў, сотні тысяч працоўных месцаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

За гады будаўніцтва Саюзнай дзяржавы рэалізавана больш за 60 сумесных навукова-тэхнічных праграм у розных сферах: асваенні космасу, інфармацыйных тэхналогіях, сельскай гаспадарцы, выпуску матэрыялаў і прыбораў. «Многія распрацоўкі паспяхова ўкараняюцца ў вытворчасць, дзякуючы чаму выконваецца праграма імпартазамяшчэння і зніжэння залежнасці ад заходніх тэхналогій», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, нагадаў, што яшчэ раней ён абмяркоўваў з Уладзімірам Пуціным няпростае пытанне імпартазамяшчэння ў сферы мікраэлектронікі. Да яе ў тым ліку вярнуліся і напярэдадні падчас перагавораў у Крамлі. Прэзідэнт падкрэсліў, што нядаўна дэталёва вывучаў гэту тэматыку ў ходзе наведвання прадпрыемства «Планар» у Мінску. Там спецыялісты запэўнілі, што самалёты і ракеты як лёталі, так і будуць лятаць — для гэтага ў Беларусі ёсць неабходныя тэхналогіі і магчымасці. «Нават у гэтым складаным пытанні мы знайшлі выхад са становішча. І ў многіх іншых. Таму мы вытрымаем», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка ўдзяліў увагу развіццю супрацоўніцтва па лініі маладых вучоных дзвюх краін. Звяртаючыся да Прэзідэнта Расіі, ён сказаў: «Моладзь сустрэлася. Тое, аб чым Вы гаварылі мне ў Мінску. Маладыя вучоныя намецілі праграму далейшага развіцця».

## Крокі па ўмацаванні бяспекі

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь і Расія стварылі эфектыўную сістэму абароны і гарантавання бяспекі, у рамках якой паспяхова функцыянуе рэгіянальная групоўка войскаў і адзіная сістэма СПА. А зробленыя крокі па ўмацаванні пагранічнай бяспекі дазволілі значна павысіць абароненасць Саюзнай дзяржавы ад міжнароднага тэрарызму, бескантрольных патокаў міграцыі, кантрабанды зброі і боепрыпасаў, наркатрафіку, незаконнай эканамічнай дзейнасці.

«Учора Прэзідэнту (Расіі. — **Зв.**) распавядаў, што проста патокам з Украіны пайшла зброя — у Расію, праз Расію да нас. У нас з Украінай граніца намертва закрыта. Праз Бранскую, іншыя вобласці пайшла зброя. Мы скончылі з Аляксандрам Васілевічам Бортнікавым (дырэктар ФСБ Расіі. — **Зв.**) сёння аперацыю. У найбліжэйшы час праінфармуем грамадства. Вы ведаеце, мы затрымалі гэтага тэрарыста, які пракраўся на тэрыторыю Беларусі, і праз Расію яго хацелі вывезці ў іншую краіну», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, КДБ і ФСБ правялі сумесную аперацыю. «Накрылі ўсю сетку. Расіяне дапрацоўваюць тут, у Расіі, па іншых напрамках. Так што ў спакоі нас не пакінуць. Сховішча — што ў Беларусі, што ў Расіі — зброі і ўзрыўчаткі ёсць. Заходзяць і бяруць гэта. Мы некалькі такіх накрылі. Таму мы ўчора вельмі сур'ёзна абмеркавалі пытанні бяспекі ў гэтым плане. Думаю, мы справімся», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён таксама зазначыў, што на міжнароднай арэне краіны праводзяць узгодненую знешнюю палітыку. «Наша супрацоўніцтва ў галіне знешняй палітыкі — гэта ўвогуле прыклад для іншых ведамстваў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## Не прайграць бітву за розумы і сэрцы

Прэзідэнт Беларусі на пасяджэнні ў Крамлі зноў нагадаў аб неабходнасці мець сур'ёзны саюзны медыяхолдынг. «Так, гэта, можа, у нейкай ступені будзе нятанна. Але, калі мы хочам, каб парадак дня гучаў (ёсць пра што гаварыць), трэба ствараць гэты медыяхолдынг, не прыклейваючы яго да нейкіх іншых арганізацый. Пра гэта мы дамовіліся. Але гэта не адразу робіцца. Тым больш што патрэбны пэўныя сродкі», — дадаў беларускі лідар.

«У пытанні інфармацыйнага супрацьборства, як і ў пытанні фарміравання магутнай ідэалагічнай падтрымкі нашага саюзнага будаўніцтва, з боку нашых грамадзян нямала зроблена. Мы, вядома, не маем права прайграць бітву за розумы і сэрцы нашых грамадзян на друкаваных, тэле-, радыё-, «лічбавых» палях бітваў», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Ідэалагічнае супрацьстаянне па лініі Захад — Усход не аслабее нават пасля таго, як замоўчаць гарматы. Гэта надоўга», — упэўнены Прэзідэнт Беларусі.

«Сітуацыю вакол нашых краін вы ведаеце. Яна няпростая. Без сумненняў, мы дастойна вытрымалі першыя масіраваныя знешнія эканамічныя ўдары. Аб гэтым шмат сказана», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы прывёў у прыклад работу па імпартазамяшчэнні. У прыватнасці, паводле яго слоў, у Расіі паспяхова асвойваецца вытворчасць тэхнікі і абсталявання для будаўніцтва і наступнага ўтрымання чыгуначных пуцей.

Прэзідэнт канстатаваў, што на змену няўдалым спробам эканамічнай блакады ідзе ваенны шантаж у выглядзе мэтанакіраванага нарошчвання сіл і сродкаў НАТА каля граніц Саюзнай дзяржавы. Асабліва вакол Калінінградскай вобласці. «Эканамічная блакада не магла ўдацца. Проста яны наскокам нас вырашылі ўзяць. Калі б падумалі сур'ёзна, яны б гэтага не рабілі, таму што эканоміка самадастатковая. Не атрымалася эканамічна — пачалі мэтанакіравана ціснуць у ваенных адносінах, — заўважыў беларускі лідар. — Узмацняецца рыторыка аб перспектыве глабальнага ўзброенага канфлікту».

Ён падкрэсліў, што ва ўмовах развязанай супраць Беларусі і Расіі інфармацыйнай, палітычнай і эканамічнай вайны, крызісу міжнароднага права і відавочнай бяздзейнасці міжнародных інстытутаў Беларусі і Расіі неабходна яшчэ больш скаардынавана і аператыўна адстойваць і абараняць нацыянальныя інтарэсы. «У сваім Пасланні я адкрыта і прама сказаў: калі будзе трэба, мы прыменім усё, што ў нас ёсць, каб абараніць нашы дзяржавы і народы, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — І нікога мы не шантажыруем. Так будзе».

## У рэжыме антыкрызісных штабоў

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ўрады Беларусі і Расіі з мінулага года фактычна працуюць у рэжыме антыкрызісных штабоў і дабіліся прыкметных вынікаў у адаптацыі эканомікі і выбудоўванні новых гандлёва-лагістычных маршрутаў. «Ужо і няма ў чым папракнуць урады. Тыя асноўныя пытанні, якія былі намечаны, вырашаны. Засталіся хвасты. Як гаворыць наш прэм'ер, мы іх за вясну даб'ём. Дзякуючы такому супрацоўніцтву абнавілі кааперацыйныя сувязі, перавялі разлікі ў гандлі стратэгічнымі таварамі на расійскія рублі, з прыцягненнем крэдытных рэсурсаў і рэалізоўваем шэраг буйных інвестыцыйных праектаў больш як на паўтара мільярда, якія нам вельмі і вельмі патрэбны — і Расіі, і Беларусі», — адзначыў Прэзідэнт.

У 2022 годзе саюзным Саветам Міністраў і Вышэйшым дзяржаўным саветам у рабочым парадку прынята 56 нарматыўных прававых актаў, накіраваных на развіццё саюзнага будаўніцтва. Сярод іх — Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Саюзнай дзяржавы, Праграма ўзгодненых дзеянняў дзвюх краін у галіне знешняй палітыкі на 2022—2023 гады, дакументы аб развіцці пагранічнай бяспекі і супрацьдзеянні тэрарызму. Таксама ўнесены змяненні ў парадак распрацоўкі і рэалізацыі праектаў і праграм Саюзнай дзяржавы.

У сваю чаргу, Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін заўважыў: «Урады і парламенты актыўна папрацавалі, падрыхтаваўшы нашу сённяшнюю сустрэчу. Па сутнасці, мы сабраліся толькі для таго, каб зафіксаваць вынікі вашай працы. Хачу вам за гэтую працу падзякаваць і выказаць надзею на тое, што, калі і будуць нейкія пытанні да гэтага часу яшчэ не ўзгодненыя (хоць я такіх не бачу), калі нешта ўзнікне ў ходзе жывых зносін і рэальнай працы, то мы, безумоўна, як гэта заўсёды і было ў практыцы нашай сумеснай дзейнасці, узгоднім і знойдзем прымальныя для абодвух бакоў рашэнні».

## Ад агульнага энергетычнага рынку — да агульнай канцэпцыі бяспекі

Кіраўнік расійскай дзяржавы таксама адзначыў значныя дасягненні ў інтэграцыі ключавых галін эканомікі. Паводле яго слоў, прадаўжаецца рэалізацыя Асноўных кірункаў рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2021—2023 гады і саюзных праграм. «Гэтая праца прыносіць канкрэтны, адчувальны вынік. Гэтую дзейнасць, як мы сёння дамовіліся, безумоўна, будзем працягваць, не зніжаючы тэмпаў», — заявіў Уладзімір Пуцін.

Паводле слоў Прэзідэнта Расіі, прадаўжаецца стварэнне аб'яднаных рынкаў нафты і газу дзвюх краін. «Да падпісання рыхтуецца дагавор па фарміраванні адзінага электраэнергетычнага рынку», — расказаў Уладзімір Пуцін.

Ён таксама падкрэсліў, што Расія і Беларусь прадоўжаць нарошчваць сваё ўзаемадзеянне ў сферы абароны і бяспекі, пашыраць супрацоўніцтва ў ваенна-тэхнічнай сферы. «Гэта, безумоўна, адпавядае карэнным інтарэсам нашых краін і народаў», — заявіў кіраўнік расійскай дзяржавы.

Уладзімір Пуцін таксама выказаўся наконт пачатку падрыхтоўкі канцэпцыі бяспекі Саюзнай дзяржавы. Паводле яго слоў, у гэтым дакуменце будуць сфармуляваны асноўныя задачы ўзаемадзеяння ва ўмовах усё большай напружанасці на знешніх межах і развязанай супраць Беларусі і Расіі санкцыйнай і інфармацыйнай вайной. «Нам, безумоўна, варта было б прадметна заняцца стратэгічным планаваннем. Мы будзем і ў далейшым умацоўваць сістэмы бяспекі Саюзнай дзяржавы, гарантуючы тым самым умовы для яе ўстойлівага, паступальнага сацыяльна-эканамічнага развіцця», — падсумаваў расійскі лідар.

**Паводле Прэс-службы Прэзідэнта.**

**Дарэчы**

### «Робім так, як робяць яны»

Кіраўніка беларускай дзяржавы журналісты папрасілі пракаментаваць заяву Прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона, зробленую ў час візіту ў Кітай, аб тым, што ні адна краіна не можа размяшчаць ядзерную зброю на тэрыторыі іншай краіны. «Я з ім згодны, — адказаў беларускі лідар. — Таму трэба выводзіць усю ядзерную зброю амерыканцам з пяці ці шасці краін, дзе яна размешчана. І кропка. Я наогул у гэтых адносінах радыкал. Я лічу, што ядзерную зброю трэба на працягу літаральна некаторага часу звезці ў адну кучу і знішчыць. Вось і ўсё. А мянціць языком, як гэты наш таварыш умее рабіць, — усе майстры. Таму добра, давайце збяром усё ў кучу і знішчым. Гэта самы лепшы варыянт. А пакуль — мы робім так, як робяць яны».

Абмяркоўваем Пасланне Прэзідэнта

# Кожная заработная плата мусіць быць заробленая

**Таццяна КУІШ, дырэктар тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Фрунзенскага раёна г. Мінска:**



— Вельмі важна, што падчас Паслання Прэзідэнта сацыяльная сфера была заўважана і ёй адведзена столькі ўвагі. Кіраўнік дзяржавы бачыць нашу няпростую працу і ведае, якую ролю мы выконваем у падтрымцы пенсіянераў, інвалідаў, шматдзетных сем'яў і іншых уразлівых катэгорый грамадзян. Як толькі ў жыцці чалавека наступае крызіс, звязаны з хваробай, узростам, іншымі складанымі праблемамі, — мы тая служба, якая адной з першых прыходзіць яму на дапамогу.

Можна канстатаваць, што наша сацыяльная сфера — адна з наймацнейшых на постсавецкай прасторы. Мы шмат кантактуем з калегамі з іншых краін, і з асабістага вопыту адзначу, што нават расійскія службы сацыяльнага абслугоўвання, у тым ліку маскоўскія, на якія ёсць магчымасць выдаткаваць больш фінансавых сродкаў, у многім пераймаюць наш вопыт і не могуць пахваліцца такімі дасягненнямі, якія ёсць у нас.

Дзякуй, што сацработнікам павышаюць заработную плату, што было зроблена летась. Будзе добра, калі яе і надалей будуць павышаць, а калі Прэзідэнт паабяцаў, значыць, гэта насамрэч будзе зроблена. Зразумела, што кожная заработная плата мусіць быць заробленая, але ўпэўнена, што сацработнікі яе адпрацоўваюць у поўнай меры. Наша роля ў грамадстве не толькі ў выплаце дапамог ці фізічным доглядзе, але і зняцці псіхалагічнай нагрузкі, клопаце аб чалавеку як аб члене сваёй сям'і.

Асабіста мяне кранула, што Прэзідэнт шмат казаў пра традыцыйныя каштоўнасці, стварэнне сям'і і выхаванне 2-3 дзяцей. Абсалютна падтрымліваю і агітую сваіх сяброўак і супрацоўніц нараджаць як мінімум траіх дзетак. Прычым важна рабіць гэта своечасова. Прыкра бачыць, калі жанчына да пэўнага ўзросту ўсведамляе, што хацела б завесці дзяцей, а здароўе і ўзрост ужо не дазваляюць гэтага зрабіць. Каб мы і надалей заставаліся краінай і нацыяй, кожная сям'я мусіць мець 2-3 дзетак.

# Гісторыя ці геаграфія?

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Аргументы для змянення фармату выніковай атэстацыі відавочныя: гэта змяншэнне нагрузкі на вучняў (было чатыры экзамены — засталося два); сумяшчэнне выпускной і ўступнай кампаніі (вынікі выпускных экзаменаў залічваюцца пры паступленні ва ўстанову вышэйшай адукацыі); уніфікацыя формаў правядзення выпускных і ўступных іспытаў (выпускнікам не патрабуецца дадатковая падрыхтоўка); больш матываваны выбар будучай прафесіі (яшчэ на этапе выбару прадмета для здачы цэнтралізаванага экзамену неабходна вызначыцца з далейшым профілем навучання); настаўнік рыхтуе навучэнцаў адначасова да выпускных і ўступных іспытаў (не патрабуюцца дадатковыя заняткі з рэпетытарам); павышэнне адказнасці настаўніка за вынікі сваёй работы і, як вынік, павышэнне якасці ведаў выпускнікоў.

Выпускная кампанія ў новым фармаце паспяхова вытрымала першы пробны іспыт 28 студзеня. У рэпетыцыі цэнтралізаванага экзамену паўдзельнічаў практычна кожны беларускі адзінаццацікласнік (52 тысячы чалавек па ўсёй краіне). Трэцяя частка выпускнікоў, якія здавалі рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен, пацвердзілі сваю ацэнку па прадмеце за другую чвэрць, адна трэць здала тэст на адзнаку вышэй за школьную, і адна трэць атрымала адзнаку ніжэй за школьную.

У якасці ўстановы, адказнай за тэхналагічнае суправаджэнне ЦЭ, вызначаны Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў. У адпаведнасці з Інструкцыяй па арганізацыі і правядзенні цэнтралізаванага экзамену, адзінаццацікласнікі павінны былі вызначыцца з навучальным прадметам, які яны будуць здаваць на ЦЭ, да 1 сакавіка. Але да 20 красавіка ў іх яшчэ ёсць магчымасць змяніць свой выбар.

«Цяпер у Беларусі ідзе рэгістрацыя на цэнтралізаваны экзамен, якая працягнецца да 20 красавіка ўключна. Самі школьнікі ўдзелу ў гэтым працэсе не бяруць. Працэдурай займаюцца школы і пункты правядзення іспытаў, за якімі гэтыя школы замацаваныя. Рэгістрацыя ідзе даволі актыўна, — расказаў **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК.** — Часу, каб вызначыцца, у выпускнікоў было дастаткова, але бываюць выключныя выпадкі, калі нехта больш уважліва вывучыў сваю будучую спецыяльнасць, схадзіў на дзень адчыненых дзвярэй у ВНУ і ў яго ўзнікла вострая неабходнасць змяніць прадмет. Пра сваё рашэнне трэба як мага хутчэй паведаміць у школе. **З 1 да 20 красавіка ўсю інфармацыю спецыялісты пунктаў правядзення ЦЭ і камісіі, створаныя ў школах і гімназіях, павінны апрацаваць і зарэгістраваць удзельнікаў у сістэме Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Менавіта камісія ўстановы адукацыі забяспечвае дакладнасць звестак, унесеных у сістэму рэгістрацыі».**

Пасля рэгістрацыі навучэнцам у школе выдадуць пропуск, а пасля здачы цэнтралізаванага экзамену — сертыфікат.

Вынікі цэнтралізаванага іспыту выдаюцца ў выглядзе сертыфіката са 100-бальнай шкалой. Затым пераводзяцца ў 10-бальную і сярэдняе арыфметычнае гадавой адзнакі і выніку ЦЭ выстаўляецца ў атэстат.

Сертыфікаты ЦЭ можна выкарыстоўваць пры паступленні ў ВНУ, а калі абітурыенту спатрэбіцца трэці экзамен, яго можна будзе здаць у выглядзе цэнтралізаванага тэсціравання.

Асобнай увагі заслугоўвае выніковая атэстацыя дзяцей са слабым слыхам, са слабым зрокам і навучэнцаў, якія маюць парушэнні апорна-рухальнага апарату. Для іх прадугледжана права выбару: або здаваць ЦЭ і адпаведна ЦТ, або здаваць выпускны экзамен у сваёй школе і ўнутраны экзамен ва ўстанове вышэйшай адукацыі. Пры гэтым дадзеная катэгорыя навучэнцаў сумесна з законнымі прадстаўнікамі павінны ацаніць свае магчымасці па запаўненні бланка адказаў. Іншыя бланкі адказаў не прадугледжаны.

Ад здачы ЦЭ могуць быць вызвалены толькі пераможцы трэцяга (абласнога, Мінскага гарадскога) і заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па навучальных прадметах.

Пераможцы трэцяга (абласнога і Мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах вызваляюцца ад аднаго цэнтралізаванага экзамену — па вучэбным прадмеце, па якім навучэнец стаў пераможцам. У атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі па гэтым прадмеце выстаўляецца 10 балаў. А пераможцы заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па навучальных прадметах вызваляюцца ад усіх цэнтралізаваных экзаменаў. У атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбных прадметах, па якіх вучань стаў пераможцам, выстаўляецца 10 балаў; па астатніх прадметах — гадавая адзнака.

Нагадаем, што здаваць ЦЭ па рускай і беларускай мовах школьнікі будуць 14 мая, па другім прадмеце на выбар — 21 мая.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**




Надвор'е

## Надыходзіць сапраўдная вясна

### Сіноптыкі абяцаюць да плюс 17

**Цяперашняя вясновая пара не вельмі нас цешыла. Ды і красавік адразу прыняў эстафету ў капрызнага і наравістага сакавіка. У першыя дні месяца ў краіне часцяком былі ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, а ў некаторых раёнах нават паспявала сфарміравацца снежнае покрыва. Аднак ў канцы гэтага тыдня красавік усё ж вырашыў узяць курс на пацяпленне, адзначылі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды ў Белгідрамеце.**

Паводле інфармацыі сіноптыкаў, тэмпературны фон павысіцца і ў начныя гадзіны будзе знаходзіцца ў межах ад плюс 1 да плюс 9 градусаў, а дзённы фон тэмператур будзе вагацца ад плюс 9 да плюс 17 градусаў. Як той казаў — даўно б так.

Сёння на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3—9 градусаў, удзень — плюс 10—16 градусаў. У суботу на большай частцы тэрыторыі Беларусі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 1 да плюс 8 градусаў, удзень — ад плюс 9 да 15 цяпла.

Таксама цёплая і дажджлівая будзе і ў нядзелю. У гэты дзень, ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах магчымыя навальніцы. Начная тэмпература паветра будзе ў межах ад плюс 1 да плюс 8 градусаў, удзень — ад плюс 10 да 16 цяпла.

У панядзелак ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 2—8 градусаў. Днём слупок тэрмометра падніменца да 9—16 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у аўторак і сераду месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1—8 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 10—17 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Згуляла пенсіянерка на анлайн-біржы...

**Днямі ў Браслаўскі РАУС звярнулася 58-гадовая жыхарка раёна. Яна паведаміла, што ўжо некалькі месяцаў з'яўляецца трэйдарам на адной з гандлёвых платформ у сецыве. Там вяскоўка мае сваіх кансультантаў, якія дапамагаюць весці справы, а таксама курыруюць фінансавыя ўліванні на рахунак.**

Дзякуючы гэтаму на балансе пенсіянеркі знаходзілася буйная сума. Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, жанчына паспрабавала вывесці яе, але зрабіць гэтага не змагла. Пад рознымі падставамі нядаўнія памагатыя адмаўляліся выконваць узятыя на сябе абавязацельствы. Пры гэтым, па падліках пацярпелай, яна паспела папоўніць свой рахунак на суму больш як 200 тысяч долараў. Частка гэтых грошай належала самой заяўніцы, а іншая была ўзятая ў доўг у некалькіх знаёмых, а таксама з трох крэдытаў.

Пасля адмовы вывесці наяўнасць з гандлёвай платформы пенсіянерка знайшла ў інтэрнэце іншую фірму, якая абяцала дапамагчы вырашыць пытанне. Ім жанчына пераявіла яшчэ 19 тысяч долараў. У абодвух выпадках выніку вяскоўка так і не атрымала.

Міліцыянерам трэба разабрацца ў заблытанай сітуацыі. Браслаўскім РАУС распачата праверка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Венесуэле затрымалі звыш паўсотні фігурантаў антыкарупцыйнага расследавання

Колькасць затрыманых у рамках антыкарупцыйнага расследавання, якое праводзяць улады Венесуэлы, узрасла да 51. Пра гэта паведаміў генеральны пракурор Тарэк Вільям Сааб, перадае ТАСС. «Магчыма, будуць новыя затрыманні, таму што падчас расследаванняў мы дапыталі некалькіх з гэтых злачынцаў, і яны прызналіся, раскрыўшы даныя аб новых адгалінаваннях», — сказаў генпракурор на прэс-канферэнцыі, якая трансліравалася ў эфіры тэлеканала Venezolana de Television. Сааб таксама ўдакладніў, што ў рамках часткі расследавання, якая датычыцца дзяржаўнай нафтагазавай кампаніі PDVSA і ўпраўлення па крыптаактывах, былі затрыманы 34 чалавекі. Як вядома, у сярэдзіне сакавіка Генеральная пракуратура Венесуэлы паведаміла аб пачатку антыкарупцыйнага расследавання пасля затрымання шэрагу дзяржслужачых. Тады ж прэзідэнт краіны Нікалас Мадура прыняў адстаўку міністра нафтавай прамысловасці краіны Тарэка эль-Айс і паабяцаў ачысціць PDVSA ад карупцыі.

### Пляменнік Джона Кенэдзі падаў заяўку на ўдзел у прэзідэнцкіх выбарах у ЗША



Роберт Кенэдзі-малодшы, які з'яўляецца пляменнікам 35-га прэзідэнта Злучаных Штатаў Джона Кенэдзі, мае намер пазмагацца за найвышэйшую дзяржаўную пасаду на наступных прэзідэнцкіх выбарах у краіне. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на тэлеканал CNN. Палітык ужо падаў заяўку на ўдзел у выбарах 2024 года. Ён мае намер балатавацца ад Дэмакратычнай партыі. Вядома, што Роберту Кенэдзі-малодшаму 69 гадоў, ён адвакат і экалагічны актывіст. Яго бацька Роберт Кенэдзі-старэйшы быў вядомы ў ЗША як палітычны і дзяржаўны дзеяч. Ён займаў пасаду генпракурора ЗША, балатаваўся ў прэзідэнты краіны ў 1968 годзе. Акрамя гэтага, Роберт Кенэдзі-старэйшы з'яўляўся родным братам Джона Кенэдзі. Цяпер аб намеры прыняць удзел у выбарах 2024 года заявілі два кандыдаты — Кенэдзі-малодшы і пісьменніца Мар'яна Уільямсан. Цяперашні прэзідэнт краіны Джо Байдэн заяўляў, што гатовы зноў паўдзельнічаць у выбарах. Тым не менш афіцыйных заяў на гэты конт ён пакуль не зрабіў.

### Навукоўцы выявілі чорную дзірку, якая ў 33 мільярды разоў цяжэйшая за Сонца

Навукоўцы з Дарэмскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія) выявілі чорную дзірку, маса якой у 33 мільярды разоў перавышае масу Сонца, паведаміў mir24.tv са спасылкай на часопіс Monthly Notices of the Royal Astronomical Society. Па словах аўтара даследавання Джэймса Найтынгейла, дадзеная чорная дзірка з'яўляецца адной з самых вялікіх з калі-небудзь выяўленых. Паводле яго слоў, гэта верхняя планка таго, наколькі вялікімі ў тэорыі могуць яны стаць, таму адкрыццё можна лічыць узрушальным. Большасць звышмасіўных чорных дзірак знаходзіцца ў актыўным стане: матэрыя, прыцягнутая блізка да іх, награваецца, вызваляючы энергію ў выглядзе святла. Яны існавалі ў нашым Сусвеце практычна з самага пачатку, найстаражытнейшыя з іх маюць узрост 13,7 мільярда гадоў.

# КРЭДЫТЫ ЗНОЎ ТАННЕЮЦЬ




## УСЯ СПРАВА Ў СТАЎЦЫ

Крыху раней Нацыянальны банк Беларусі абвясціў аб зніжэнні стаўкі рэфінансавання да 10,5 % гадавых з 3 красавіка. Зніжаюцца і іншыя банкаўскія сістэмныя стаўкі. Як тлумачыць сваё рашэнне рэгулятар, зніжэнне стаўкі зроблена, паколькі інфляцыя працягвае фарміравацца паблізу чаканай траекторыі.

У лютым гадавы прырост спажывецкіх цэн запаволіўся да 11,7 працэнта пры 12 працэнтах месяцам раней. Трэндавая інфляцыя таксама дэманструе ўстойлівую дынаміку да запаволення. У другім месяцы года яна склала 8,9 % пры 9,2 % у папярэднім месяцы. Нацбанк упэўнены, што пасля выхаду ў сакавіку гадавога паказчыка інфляцыі на аднaзначную велічыню тэндэнцыя запаволення тэмпаў росту спажывецкіх цэн працягнецца і ў другім квартале.

## НА ШТО ГЭТА ЎПЛЫВАЕ?

Стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка задае кошт грошай у эканоміцы. Груба кажучы, па гэтай стаўцы наш галоўны банк крэдытуе камерцыйныя банкі. Часта банкі, выдаючы пазыкі спажыўцам, фарміруюць сваю стаўку па формуле «стаўка рэфінансавання плюс колькі працэнтных пунктаў». Гэта значыць пры змяненні стаўкі рэфінансавання аўтаматычна карэкціруюцца стаўкі па крэдытах для бізнесу і фізічных асоб.

Трэба сказаць, што камерцыйныя банкі ўстойліва зніжаюць стаўкі па новых крэдытах апошнія месяцы, сведчыць статыстыка Нацбанка. Да гэтага іх падахвочвае і сам рэгулятар, які зніжае «стоць» ставак.

Фінансавыя эксперты лічаць, што такі рух стаўкі рэфінансавання быў чаканым. Росту беларускай эканомікі мяркуецца дасягнуць за кошт павелічэння аб'ёмаў інвестыцый. Справа ў тым, што знешнія крыніцы ў нашай краіны абмежаваныя, а значыць, у большай ступені задзейнічаюць унутраныя рэзервы, у тым ліку банкаўскую сістэму. Для гэтага прадугледжана змякчэнне грашова-крэдытнай палітыкі. Зніжэнне стаўкі рэфінансавання, а паралельна з ёй ставак па крэдыце авернайт і дэпазіце авернайт — можна сказаць, пачатак рэалізацыі дадзенай палітыкі. Гэта значыць, што грошы ў банкаўскай сістэме стануць больш таннымі. Трэба адзначыць: у канцы мінулага года запаволілася інфляцыя. Як падкрэслівае Нацбанк, гэта дало магчымасць перагледзець і ўзровень стаўкі рэфінансавання.

Якая агульная тэндэнцыя па кошце крэдытных грошай? Большасць крэдытных прадуктаў банкаў прывязаная да стаўкі рэфінансавання або стаўкі авернайт, таму крэдытныя працэнты па такіх прадуктах таксама зменшаліся. Асабліва прыкметна ў грашовым выражэнні гэта назіраецца ў крэдытах на буйныя пакупкі накшталт нерухомасці; аўтакрэдытах, а таксама крэдытах для юрыдычных асоб. Сёлета стаўка рэфінансавання зніжаецца ўжо трэці раз.

## ЗНІЖЭННЕ БЫЛО ПАПЯРЭДНІМ

Першым пачаў зніжаць свае стаўкі па крэдытах для насельніцтва Беларусбанк. Ён яшчэ 29 сакавіка абвясціў аб тым, што стаўка па раней атрыманых крэдытах на фінансаванне нерухомасці будзе зніжана.

Новая крэдытная стаўка склала 16,31 % гадавых, тут неістотна, з ужываннем фіксаванай стаўкі вы бралі крэдыт або пераменнай. Каб атрымаць зніжку, неабходна заключыць дадатковае пагадненне да крэдытнага дагавора, пагадзіўшыся з афертай, размешчанай на карпаратыўным сайце банка.

Зрабіць тое даволі проста. Дакладней, нічога і рабіць не трэба: пацвярджэннем прыняцця аферты выступае ўнясенне чарговага плацяжу па выплаце працэнтаў за карыстанне крэдытам у змененым памеры.

Сёлета стаўкі па іпатэчных крэдытах Беларусбанк зніжаў ужо некалькі разоў — услед за памяншэннем памеру ключавой стаўкі Нацбанкам. У апошні раз — да 10,5 % з 3 красавіка. Беларусбанк не стаў чакаць «гадзіны Х» і знізіў памер іпатэчнай стаўкі з апошніх дзён сакавіка.

## САМАЯ «СМАЧНАЯ» ПАЗЫКА

Гэтую пазыку на спажывецкія патрэбы на пяць гадоў таксама прадстаўляе Беларусбанк. Памер дадзенага крэдыту знаходзіцца ў межах плацежаздольнасці атрымальніка, але не меншы за 100 рублёў. Для фізічных асоб, што ажыццяўляюць прадпрымальніцкую, рамесную або іншую дзейнасць, якая не патрабуе рэгістрацыі ў якасці ІП у адпаведнасці з заканадаўствам, — у памеры, што не перавышае 600 базавых велічынь, у межах плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка, але не меншы за 100 рублёў

Працэнтная стаўка крэдыту — ад 12 % да 13,5 % у залежнасці ад падачы заяўкі на крэдыт праз каналы дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання. Спосаб давання крэдыту шляхам безнаяўнага пералічэння на рахункі трэціх асоб ажыццяўляецца з выплатай працэнтаў за фактычны час карыстання крэдытам. У якасці забеспячэння прадстаўляецца няўстойка або паручыцельства іншых фізічных асоб. Характэрна, што памер крэдыту пад няўстойку не можа перавышаць 400 базавых велічынь на дату рэгістрацыі заявы-анкеты, для грамадзян, якія знаходзяцца ва ўзросце ад 65 да 70 гадоў, — 100 базавых велічынь на дату рэгістрацыі заявы-анкеты. Для кліентаў, старэйшых за 70 гадоў, у якасці забеспячэння прымаецца толькі паручыцельства іншых фізічных асоб.

Для атрымання такога недарагога крэдыту кліенту неабходна прадставіць дастаткова аб'ёмную папку дакументаў. Тры галоўныя паперы з іх — дакумент, які сведчыць асобу заяўніка (паручыцеля); рахунак-фактура-(ы) (дагавор-(ы)) з указаннем вытворцы прадукцыі; дакументы, якія пацвярджаюць даходы заяўніка (паручыцеля): даведкі (выпіска, пры ўмове залічэння даходаў на картку ва ўстановах банка).

## БЕЗ ПАРУЧЫЦЕЛЯЎ — ТРОХІ ДАРАЖЭЙ

Камерцыйны банк сталіцы выдае адзін крэдытны прадукт «Прыстойнае на асабістае» да 30 тысяч рублёў тэрмінам да 36 месяцаў. Стаўка такога крэдыту — ад 15,4 % гадавых. Умовы ў банка больш мяккія, грошы даюцца без паручыцеляў, патрэбна толькі даведка аб даходах. І яшчэ: узрост крэдытаатрымальніка павінен быць ад 21 года да 64 гадоў.

Ёсць і таннейшы крэдыт (14,91 % гадавых), але сума яшчэ меншая (да 10 тысяч рублёў). У дадзеным выпадку не патрэбныя паручыцелі і даведкі аб даходах. Затое ёсць спецыяльнае патрабаванне да атрымальніка. Кліент павінен быць з пашпартам грамадзяніна Беларусі з пастаянная прапіскай.

Самы даступны крэдыт «На асабістае» з сумай да 10 тысяч рублёў мае стаўку ад 14 %. Тут не патрэбныя паручыцелі і даведкі, а ўзрост атрымальніка — ад 18 да 68 гадоў. Праўда, такія грошы вам дадуць усяго толькі на год.

## ЧАГО ЧАКАЦЬ НАДАЛЕЙ?

Нацбанк у красавіку паменшыў таксама разліковую велічыню стандартнай рызыкі. Гэты паказчык для крэдытаў, дадзеных юрыдычным асобам (без уліку льготных), зніжаецца да 11,85 % гадавых з 12,58 % у сакавіку, а аналагічная велічыня па крэдытах фізічным асобам (без уліку льготных) памяншаецца да 15,41 % з 16,31 %.

Разліковая велічыня стандартнай рызыкі разлічваецца Нацбанкам на аснове сярэдніх працэнтных ставак, устаноўленых сямю сістэмна значнымі банкамі краіны, за месяц, які папярэднічае месяцу разліку, па фінансавых інструментах крэдытна-дэпазітнага рынку ў нацыянальнай валюце. Такім чынам, названыя вышэй паказчыкі на красавік адпавядаюць сярэднім стаўкам па новых крэдытах у сакавіку. На гэтую велічыню цяпер будуць арыентавацца ўсе іншыя банкі.

Мяркуючы па разліковых велічынях, працэнты па крэдытах банкамі памяншаюцца хутчэй, чым стаўка рэфінансавання. Гэта звязана з тым, што ў фінустановах сфарміраваўся лішак рублёвай ліквіднасці, і ім даводзіцца памяншаць працэнты па крэдытах.

Паколькі Нацбанк упэўнены ў хуткім зніжэнні інфляцыі і, цалкам верагодна, будзе ў найбліжэйшыя месяцы зніжаць стаўку рэфінансавання, то і Беларусбанк, і іншыя банкі таксама зрэжуць свае іпатэчныя апетыты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Тым часам

# ЦЭНЫ НА ЗОЛАТА ВЫРАСЛІ

**Як адзначаюць фінансавыя аналітыкі, на гэтым тыдні золата падаражэла да самага высокага ўзроўню за 13 месяцаў. Цікава, што забяспечыла яго рост?**

Менавіта цяпер цэны на золата дасягнулі новых максімумаў і могуць працягваць расці, набліжаючыся да пікавых значэнняў амаль трохгадовай даўнасці. У ліку фактараў, якія спрыяюць падаражэнню каштоўнага металу, эксперты называюць глабальную эканамічную нявызначанасць і аслабленне долара.

Як паведамляецца, цэны на золата ў сярэдзіне гэтага тыдня выраслі на 2,1 % і пераадолелі адзнаку ў дзве тысячы долараў за ўнцыю ўпершыню з сакавіка 2022 года. Прычынай сталі **амерыканскія звесткі за люты аб скарачэнні колькасці працоўных месцаў да самага нізкага з мая 2021 года ўзроўню. Яшчэ адна свежая статыстыка за той жа перыяд паказала, што колькасць новых заказаў на вырабленыя ў ЗША тавары падае другі месяц запар.**

Акрамя таго, на рост цаны каштоўнага металу паўплывала аслабленне (на сусветных біржах) долара — зліткі сталі таннейшымі для пакупнікоў, якія валодаюць іншымі валютамі.

Цана на золата павялічылася на 12 % толькі за апошні месяц і на 25 % з таго часу, як яна дасягнула мінімуму ў лістападзе. Калі падобны рост працягнецца, то неўзабаве яна можа наблізіцца да абсалютнага рэкорду жніўня 2020 года, калі ўнцыя каштавала даражэй за 2070 долараў.

Агульнасусветная інфляцыя і непрадказальнасць эканомікі з'яўляюцца дзвюма асноўнымі прычынамі істотнага росту цаны на золата. Каштоўныя металы традыцыйна лічацца для інвестараў актывам-прыстанішчам, які можа зберагчы іх сродкі ад уздзеяння эканамічнай нявызначанасці, аднак дзяржаўныя аблігацыі з высокімі працэнтнымі стаўкамі звычайна больш прывабныя, чым золата.

Вядомы аналітык Дэвід Ленакс у сваім каментарыі Bloomberg адзначыў, што цяпер цану на золата вызначаюць асцярогі з нагоды долара, улічваючы што эканамічныя фактары не аказваюць значнай падтрымкі валюце. Паводле яго слоў, дадатковымі прычынамі з'яўляюцца фінансавыя апасенні інвестараў, у тым ліку ў сувязі з нядаўнім банкаўскім крызісам у ЗША, а таксама ростам геапалітычнай напружанасці.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Крымінал

# «Дарагі» ты мой чалавек...

**Жыхар Магілёва выкраў у сваёй дзяўчыны залатыя ўпрыгожанні на агульную суму амаль 5000 рублёў.**

У аператыўна-дзяжурную службу Кастрычніцкага РАУС горада з заявай звярнулася 25-гадовая жыхарка абласнога цэнтра, у якой з кватэры выкралі залатыя ўпрыгожанні, а таксама 200 долараў і 50 еўра, паведамляе УУС аблвыканкама.

Сышчыкі высветлілі, што напярэдадні дзяўчына аддала ключы ад кватэры свайму хлопцу. Малады чалавек меў фінансавыя цяжкасці і, скарыстаўшыся адсутнасцю гаспадыні, выкраў яе маёмасць, пасля чаго здаў каштоўнасці ў ламбард. Атрыманыя грошы патрацціў на пагашэнні даўгоў.

Па факце крадзяжу следчымі заведзена крымінальная справа. Выкрадзеная маёмасць канфіскавана і вернута ўладальніцы.

# «Амерыканец» падмануў больш чым на 6000 долараў

**У сярэдзіне чэрвеня 62-гадовая жыхарка Ліды пазнаёмілася ў сацыяльнай сетцы з чалавекам, які назваўся грамадзянінам ЗША. Мужчына расказаў, што на гэты момант праходзіць службу міратворцам у Сірыі. У ходзе далейшых стасункаў ён паведаміў, што адправіў свае асабістыя рэчы і грошы самалётам і пасылка прыйдзе на адрас жанчыны. Як падзеі разгортваліся далей, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

У снежні 2022 года ёй прыйшло паведамленне на месенджар, што пасылка прыбыла і для яе атрымання неабходна заплаціць 1200 долараў, якія пойдуць на выплаты мытнага збору Рэспублікі Беларусь. Жанчына пагадзілася і пераявла патрэбную суму.

Аднак замест абяцанай пасылкі ў хуткім часе прыйшло новае паведамленне аб неабходнасці аплаты, толькі гэтым разам ужо 1500 долараў. Грамадзянка пераявла і гэтую суму. Крыху пазней у месенджары з'явілася паведамленне аб неабходнасці выплаты мытнага збору ў памеры 3400 долараў. Гэтую суму жанчына таксама заплаціла.

Пазней прыйшло яшчэ адно паведамленне аб выплаце. Нарэшце грамадзянка зразумела, што вядзе перапіску з ашуканцамі і звярнулася па дапамогу ў Лідскі РАУС. Падчас аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў праваахоўнікі адсачылі маршрут перамяшчэння грашовых сродкаў. Яны былі выведзены за мяжу. А атрымальнікам аказаўся не грамадзянін Злучаных Штатаў Амерыкі, а жыхар Нігерыі.

Па дадзеным факце Лідскім раённым аддзелам Следчага камітэта заведзена крымінальная справа па артыкуле «Махлярства, здзейсненае ў буйным памеры».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

З нагоды

# ТРАНСЛЯЦЫІ ВЕЛІКОДНЫХ БОГАСЛУЖЭННЯЎ У ТЭЛЕЭФІРЫ

**Ужо ў нядзелю 9 красавіка вернікі каталіцкай канфесіі сустрэнуць Светлае Хрыстова Уваскрэсенне. Традыцыйна ў эфіры тэлеканалаў Белтэлерадыёкампаніі пройдуць трансляцыі святочных богаслужэнняў з Мінска, Рыма і Ватыкана.**

У пятнічным эфіры канала «Беларусь 3» адбудзецца трансляцыя Крыжовага шляху з Рымскага Калізея з удзелам Папы Францыска. Пачатак паказу цырымоніі — у 23.25. Падчас ходу, які штогод праходзіць у італьянскай сталіцы ў Вялікую пятніцу, удзельнікі яго на чале з пантыфікам здзяйсняюць 14 стаянняў, якія ўяўляюць з сябе ўспаміны шляху Ісуса Хрыста на Галгофу. Цырымонія суправаджаецца разважаннямі і малітвамі, якія зачытваюцца падчас шэсця.

У суботу 8 красавіка ў 21.45 у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» пройдзе трансляцыя цэнтральнага велікоднага богаслужэння з удзелам кіраўніка Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі са сталічнага архікафедральнага касцёла імя Найсвяцейшай Дзевы Марыі.

А ў святочны дзень 9 красавіка ў 7.15 у эфіры «Беларусь 1» са Словам на свята Уваскрэсення Хрыстова выступіць архіепіскап Іосіф Станеўскі. Пасля ў 17.00 у трансляцыі з Ватыкана сацыякультурны тэлеканал пакажа Пасланне і Блаславенне Папы Рымскага Францыска «Гораду і свету».

Варта адзначыць, што для зручнасці вернікаў трансляцыі богаслужэння са сталічнага касцёла імя Найсвяцейшай Дзевы Марыі будуць суправаджацца сурдаперакладам.

**Алена ДРАПКО.**


## «Са "Звяздою" — спадручней!»



Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на ІІ квартал або на І паўгоддзе 2023 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2023 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем прасаў Holt HT-IF-010 і суперпрыз — вертыкальны пыласос Deerma DX700S. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 29 красавіка 2023 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 чэрвеня 2023 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на ІІ квартал або на І паўгоддзе 2023 года. Пасля 30 чэрвеня 2023 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ад падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 38 ад 25 лютага 2023 года.

**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4288 ад 15.02.2023 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на ІІ квартал або І паўгоддзе 2023 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
*(аддзяленне сувязі)*

**на ІІ квартал або І паўгоддзе 2023 года**

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* ________ ____________
*(індэкс)*

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!


## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 169

**У штогадовым конкурсе расійскага часопіса «Шахматная кампазіцыя» задача Мікалая Бельчыкава з г. Барысава адзначана спецыяльным ганаровым водгукам за мініяцюру (*гл. дыяграму*).**



**Белыя:** Kpd4, Фа5, Cf7, Ke8, Kg6, пh2 (6).
**Чорныя:** Kpg4 (1).
**Мат за 2 хады.**

**Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru**

* * *

У тым жа конкурсе задача Міхаіла Кошаля (Мінск) атрымала пахвальны водгук.

**Белыя:** Kpd2, Фс7, Лс4, Cd1, Kh4, пп. a2, a4, c3 (8).
**Чорныя:** Kpd5, Ла6 (2).
**Мат за 2 хады.**

Спачатку гатова 1...Ле6 2. Фс5, Лd4х Падманныя сляды: 1. Фе7? ~ 2. Лс5х, 1...Ле6 2. Фс5х, 1...Лс6 2. Лd4х, 1...Лd6 2.Фе4х, 1...Кр:с4 2. Cb3x, але 1...Ла5! Рашае 1. Ле4! ~ 2. Ле5х, 1...Ле6 2. Лd4х, 1...Лс6 2. Фе5х, 1...Лd6 2. Фс4х, 1...Кр:е4 2. Cf3x

* * *

У Мінску адбыліся першынствы Беларусі сярод удзельнікаў да 12, 14 і 16 гадоў.

Сярод юнакоў прызёрамі сталі:

да 12 гадоў — 1) Кірыл Бабейкін (Мінск); 2) Міхаіл Дзенісеня (Мінск); 3) Захар Емяльянаў (Вілейка);

да 14 гадоў — 1) Антон Цімашэнка (Баранавічы); 2) Андрэй Рудней (Мінск); 3) Аляксандр Гвоздзь (Мінск);

да 16 гадоў — 1) Арцём Стрыбук (Мінск); 2) Цімур Гвоздзеў (Магілёў); 3) Міхей Наўменка (Орша).

Сярод дзяўчат:

да 12 гадоў — 1) Дар'я Сакун (Гомель); 2) Аляксандра Каспяровіч (Мінск); 3) Марыя Рамановіч (Брэст);

да 14 гадоў — 1) Лізавета Ляшкевіч (Мінск); 2) Ніка Венская (Мінск); 3) Мілена Сідарэня (Баранавічы);

да 16 гадоў — 1) Юлія Лявонава (Гомель); 2) Ксенія Норман (Гродна); 3) Марына Хоміч (Мінск).

* * *

Прызавую тройку першынства Беларусі сярод інвалідаў па зроку склалі Вячаслаў Смольскі (Асіповічы), Юрый Бучкоў (Мінск) і Юрый Тысенчук (Брэст).

У бліцтурніры на сайце chess.com Дзяніс Лазавік падзяліў 1-3-е месцы з 464, у аналагічным спаборніцтве Сяргей Жыгалка заняў 16-е месца з 430.

* * *

Наступная партыя была згуляна на сёлетнім чэмпіянаце Беларусі ў вышэйшай лізе.

Арцём Сіняўскі — Сяргей Вашчылаў. 1. e4 d5 2. ed Ф:d5 3. Кс3 Фd6 4. d4 Kf6 5. h3 c6 6. Kf3 Cf5 7. Ce2 h6 8. 0-0 e6 9. Ле1 Kbd7 10. Cf1 0-0-0 11. Ke2 g5 12. c4 Фb8 13. Kg3 Ch7 14. Фе2 Cb4 15. Cd2 Cd6 16. Ca5 b6 17. Cc3 C:g3 18. fg Ke4 19. g4 Лhe8 20. a4 c5 21. a5 Kg3 22. Фе3 Се4 23. ab ab 24. b4 f5 25. bc fg 26. Ke5 K:e5 27. de gh 28. Ф:g3 hg 29. C:g2 Лd3 30. Ле3 Л:е3 31. Ф:е3 C:g2 32. Kp:g2 Фb7+ 33. Фf3 Ф:f3+ 34. Kp:f3 Лf8+ 35. Kpe3 Лf4 36. cb Л:c4 37. Cd4 Лb4 38. Лh1, 1:0.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Лс4! Правільна адказалі Міхаіл Кошаль, Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цыльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# КІНО ЯК ВЫБАР ЖЫЦЦЯ

**Свой 85-гадовы юбілей 10 красавіка адзначыць беларускі рэжысёр, сцэнарыст, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Таджыкістана Маргарыта Касымава. З нагоды святочнай даты на сацыякультурным тэлеканале глядзіце праект «Кадры жыцця» з удзелам імянінніцы і не прапусціце паказ яе мастацкага фільма «Бальная сукенка».**



Фота з сайта belarusfilm.by.

Дарэчы, кінастужка ўбачыла свет на кінастудыі «Беларусьфільм» у 2003 годзе — і, значыць, сёлета таксама адзначае свае 20-годдзе. Над фільмам Маргарыта Касымава працавала сумесна з рэжысёрам Ірынай Волах.

Няшчасны выпадак абрывае жыццё бацькі пятнаццацігадовай Вікі, а яна застаецца жыць з прыёмнай маці. Хоць жанчына і хварэе, але з цеплынёй і любоўю клапоціцца пра дзяўчынку. Толькі вось бяда, ёсць сваячка, якая мае план завалодаць іх кватэрай у сталіцы. І цяпер і Віку, і яе мачаху чакаюць выпрабаванні... Фільм наглядна паказвае, што па-сапраўднаму шчаслівымі людзей у сям'і робяць любоў, давер і ўзаемаразуменне. А чалавечая крывадушнасць ніколі не застаецца без наступстваў. Пры гэтым у карціне можна прасачыць і тое, як будуюцца ўзаемаадносіны бацькоў з дзецьмі-падлеткамі, як сыны і дочкі адстойваюць сваю асабістую прастору, уласныя жаданні, будуюць адносіны з аднагодкамі і многае іншае. Прычым у кадры ўсё тое робіцца хоць і вельмі пунктырна, але пры гэтым павучальна. І вобразы дарослых у фільме дэманструюць цэлую палітру чалавечых характараў, дзе глядач бачыць кагосьці чыстым і падатлівым чужому ўплыву, кагосьці — у пакутах ад памылак мінулага. А галоўнае, там, чырвонай ніткай выступае напамін усім бацькам, што ў любым узросце нашы дзеці вучацца жыць, гледзячы на прыклад тых, хто побач з імі. І самае галоўнае — у любой сітуацыі рабіць крок насустрач адно аднаму. Менавіта праз такія сітуацыі і спазнаецца жыццё, дзе кожны незалежна ад узросту спасцігае свае ўрокі.

На экране герояў кінастужкі ўвасобілі акцёры Мікалай Раеўскі, Алена Барушка, Таццяна Баўкалава, Анастасія Немаляева, Аляксандр Васільеў, Марына Магілеўская, Святлана Бароўская і многія іншыя. «Бальная сукенка» была таксама адзначана ўзнагародамі, сярод якіх Гран-пры пятага кінафестывалю дзіцячых і юнацкіх фільмаў «Лістападзік» 2003 г. і Гран-пры ў секцыі «Дзіцячае кіно» на другім кінафестывалі «Маскоўская прэм'ера» 2004 г., але галоўнае — да сённяшняга фільм не страціў сваёй актуальнасці. Таму што ён запрашае аўдыторыю да адкрытай размовы на вельмі важныя тэмы і вяртае веру ў сапраўдныя цуды, якія мы здольныя рабіць самі.

Што да асобы рэжысёра, адкрыць Маргарыту Касымаву гледачы сацыякультурнага канала змогуць падчас прагляду выпуску праграмы «Кадры жыцця». У гутарцы з вядучым мы пачуем пра цікавы лёс першай жанчыны-рэжысёра Сярэдняй Азіі, якая са сваімі работамі аб'ехала паўсвету. «Сысці з прафесіі вельмі лёгка. А трэба ўмець змагацца за сваё месца ў жыцці. Для гэтага патрэбна жадаць...», — адзначыла яна ў размове. Маргарыта Наімаўна таксама падзялілася сваімі ўспамінамі, поглядамі на жыццё, разважаннямі аб прафесіі і сучаснасці.

**Алена ДРАПКО.**

Медыявымяральнік

# Як мы глядзелі тэлевізар у сакавіку

**Вясной тэмпы адмоўнай дынамікі адносна аўдыторыі тэлебачання запаволіліся: на тры працэнты ў параўнанні з лютым упаў рэйтынг ТБ і на столькі ж скараціўся сярэднесутачны час прагляду «блакітнага экрана» сярод насельніцтва (у лютым гэты паказчык быў роўны 6), менш як на працэнт зменшыўся сярэднясутачны ахоп аўдыторыі.**

